## Урок беларускай літаратуры ў 10 А класе

**Тэма:** Водная стыхія ў творах Якуба Коласа. Правілы беражлівасці да вады.
**Мэта:**

- узгадаць творы Якуба Коласа, дзе вобраз крыніцы, крынічкі, ракі, ручая мае алегарычны сэнс,
- аднавіць у памяці апісанне гэтых вобразаў,
- вызначыць ролю аўтарскага апісання водных стыхій у мастацкіх творах,
- сфармуляваць правілы беражлівасці да вады,
- скарыстоўваць іх у жыцці.

**Форма класнай гадзіны**: дыялог.
**Эпіграф**: Вада - бясколерная, празрыстая вадкасць без паху і смаку. (З даведніка)

### Ход мерапрыемства :

1. Арганізацыйны момант.
2. Псіхалагічны настрой: гучыць музыка. (шум вады)
Які настрой зараз у вас, якое адчуванне?
(успамін аб леце, спакой, замілаванне прыродай)
3. Асноўная частка.
Слова настаўніка.
Беларусь называюць сінявокаю. Гэта ад мноства вады на нашай зямлі - калі падняцца ў космас ці хаця б зірнуць на яе з-пад крыла самалёта, кожны ўбачыць, як яна ўся ўпрыгожана сінімі вачамі - люстэркамі азёр і спавіта блакітнымі стужкамі рэк.

На Беларусі 20 800 рэк і рэчак і 10 800 азёраў. Толькі на Віцебшчыне дзве з паловай тысячы азёраў!

Нашы рэкі часам бяруць свой пачатак не на зямлі, а ў небе: іх нараджаюць хмары. Ападкі ў выглядзе дажджу і снегу, калі ён растае, становяцца вытокамі нашых рэк і рэчак. Але беларускія рэкі пачынаюцца не толькі з неба, але і з падземных вод - б'е, пульсуе з-пад зямлі маленечкая крынічка, а ад яе завязваецца, пачынае журчаць такі ж самы маленькі ручаёк. Бывае, што нашы рэкі нараджаюцца ў азёрах, а то і ў балотах.
Узгадаем верш класіка беларускай літаратуры Якубы Коласа "Ручэй" (вучань 1)
Беларусь мае падземныя рэкі і ручаі. Мае вялікія азёры пад зямлёю - прыродныя сховішча чыстай пітной вады.

І мінеральныя крыніцы - разведалі ўжо 87 відаў каштоўнай мінеральнай вады

па ўсёй Беларусі. Гэтыя крыніцы - невычарпальнае багацце нашага здароўя, нашай сілы і моцы.

Ды і самая звычайная наша вада - лекавая. Большасць насельніцтва Беларусі карыстаецца пітной вадою з падземных водазабораў. А артэзіянская вада, паднятая да нашага стала з глыбіні ад 60 да 400 метраў, не патрабуе ніякай ачысткі - яна і без гэтага чыстая і светлая, як крышталь.

Чытаецца ўрывак з казкі Якуба Коласа "Крыніца" (вучань 2)
Скажу проста: гэтая крынічка, напэўна, частавала сваёю вадою яшчэ вашых дзядоў-прадзедаў. Яе вада - найчысцейшыя слёзы веснавых хмарак, што ад узнікнення свету ходзяць над зямлёю такімі прыгожымі чародкамі. Яе бераж кі - аксамітныя межы, з-пад гэтых аксамітаў ззяе золата жоўтых пяскоў.

А тыя землі, што ляжалі побач! Колькі хараства, колькі мудрага задумення было ў іх!

Не дзіва, што тут, каля крынічкі, кіпела жыццё, бо кожнаму хацелася стаць бліжэй да вады, каб палюбавацца на сваё ўласнае хараство ў яе люстры, як гэта любілі рабіць прыгожыя краскі. Другім хацелася паслухаць цікавую музыку, якую складалі дробненькія хвалькі, скачучы з каменьчыка на каменьчык, трэція блукалі тут, каб крыху адпачыць у прахалодзе бліскучых хваль, чацвёртыя гарнуліся сюды проста гледзячы на другіх.

Дык якая ж у нас рака або возера самае прыгожае? Самая прыгожая, кажаце? Ніякая або ніякае! Няма ў нас такіх! Бо ўсе нашы рэкі і ўсе нашы азёры - самыя прыгожыя! Калі не верыце - наведайцеся на самую маленькую, самую непрыкметную рачулку, якая, можа, і назвы не мае, - і вы пераканаецеся ў гэтым: якраз яна - самая прыгожая!

Чытаецца ўрывак з казкі Я. Коласа "Жывая вада" (вучань 3)

Шчаслівы то быў куточак Божага свету. Вольна жылося людзям у тым краі. Ніхто іх не гнаў, ніхто іх не крыўдзіў, нікому яны не належалі . Багатая, урадлівая была іх зямля. Шырока раскінуліся палі, зялёныя травы сенажацей калыхаліся на ветры. І весела смяяліся кветкі, нахіляючы свае пахучыя галоўкі і пазіраючы ў раку, якая паіла ўвесь той кут і тых, хто жыў і рос там, і давала ім жыццё. Усё жыло каля ракі, гэту раку людзі называлі Жывою Вадою. Усё жывое і нежывое любіла яе, і песні волі разліваліся па ўсіх кутках шчаслівай старонкі.

Уся наша вада - жывая вада. Аднак ёсць у нас і святая вада. Святыя крыніцы. Яны нашы лекары і супакаяльнікі. Напіўся святой вады - і ўжо нічога не баліць. Напіўся са святой крыніцы - і ты ўжо здаровы.

Беларусы заўсёды паважалі ўсе свае крыніцы, а святыя дык найболей. Яны называліся ў нас яшчэ прошчалі, людзі маліліся ім, прасілі здароўя. Купалі ў іх хворых дзяцей, тыя выздараўлівалі. Жывую ваду нараджалі толькі крыніцы!

Нашы руплівыя мнагаводныя рэкі Прыпяць, Бярэзіна, Сож, Свіслач, Ясельда, Гарынь, Проня, Бесядзь, Нёман, Дняпро, Дзвіна, што сабралі ваду амаль з ўсёй Беларусі, робяцца магутнай ракой, якая ўпадае ў Чорнае мора. Так што беларусы, плаваючы ў Чорным моры, могуць цешыць сябе думкаю, што купаюцца яны і ў сваёй роднай вадзе - 56 беларускіх прытокаў Дняпра не даюць гэтаму цудоўнаму цёпламу Чорнаму мору абязводжвацца.

Чытаецца ўрывак з паэмы Я. Коласа "Новая зямля" (раздзел "Леснікова пасада") (вучань 4)

Вада - адна з чатырох асноўных стыхій, што ўтвараюць сусвет: паветра судакранаецца з ёю, агонь баіцца яе, а зямля ўвогуле абапіраецца на ваду. Неба, дождж праз ваду апладняе нашу маці - зямлю.

Усе мы павінны шанаваць сваю ваду.

А каб засведчыць любоў і павагу да яе, у нас ёсць свята вады - 22 сакавіка ўсе людзі Зямлі святкуюць Міжнародны дзень водных запасаў.

**А вось правілы захавання водных рэсурсаў мы сфармулюем самі**:
1. Не трымайце кран адкрытым, калі чысціце зубы.
2. Прымайце душ, а не ванну.
3. Не дазваляйце цекчы вадзе, калі мыеце посуд.
4. Вада для мыцця адна, для паласкання - другая.
5. На дачы збірайце дажджавую ваду.
6. Не размаражвайце прадукты пад вадой, лепш пакласці іх раней для размарозкі.

**Дывіз**: Кропля за кропляй, кропля за кропляй - акіян, кропля за кропляй, кропля за кропляй - тэрмінова пачыні кран.

**Вывад**: Захоўвай водныя рэсурсы!